Источник: **«Звязда» - 2012-11-22**

# Айчынныя вучоныя распрацавалі ўнікальную сістэму авіяцыйных здымкаў

**Пра гэта паведаміў загадчык лабараторыі сістэматэхнікі Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі, кіраўнік задання дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы "Касмічныя сістэмы і тэхналогіі" Мікалай Мурашка, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Створаная ў Беларусі сістэма авіяцыйных здымак не мае аналагаў на постсавецкай прасторы. Яе плануецца выкарыстоўваць у інтарэсах Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Дзяржаўнага камітэта па маёмасці. Апаратура таксама дасць магчымасць больш эфектыўна развіваць авіяцыйны сегмент сістэмы дыстанцыйнага зандавання Зямлі.

Авіяцыйныя здымкі для вырашэння розных задач рабіліся ў Беларусі і раней. Аднак для гэтага выкарыстоўваліся плёнкавыя апараты, якія даюць недастаткова высокую якасць выявы. "Прыйшлося выбіраць: альбо купляць сучасную лічбавую апаратуру за мяжой (а кожны такі апарат каштуе каля $1,5 млн), альбо распрацоўваць уласнае абсталяванне", — растлумачыў вучоны.

Беларуская працуе як у бачным, так і ў інфрачырвоным спектрах. "Па сутнасці, гэта своеасаблівая лятаючая лабараторыя", — адзначыў Мікалай Мурашка. Абсталяванне дазваляе распазнаваць аб'екты памерам у некалькі сантыметраў з вышыні 1 км і атрымліваць як плоскія, так і трохмерныя выявы.